матэрыялу. У духу рамантызму пісьменнік называе свой зборнік «Дудар беларускі», і менавіта так пачалі называць В. Дуніна-Марцінкевіча.

У сваіх творах мастак слова пры дапамозе моўных сродкаў здолеў стварыць сапраўдны нацыянальны каларыт. «За этнаграфізмам твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, за аўтарскім захапленнем старажытнымі легендамі і абрадамі, святочным бытам беларусаў адчувальна заўсёднае жаданне дапамагчы селяніну, імкненне неяк упрыгожыць і аблегчыць яго жыццё. Многія паэтычныя творы пісьменніка звернуты не столькі да селяніна, колькі да пана, да «адукаванай» аўдыторыі» [1, с. 82].

Мэтазгодна выдзеліць наступныя лексіка-семантычныя пласты ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча: назвы ежы і пітва: *трасцянка, боршч са сланінай, верашчака, грэцкія бліны, крупнік, лямешка, шынка, квас, зразы* і інш; назвы адзення і абутку: *какарда, лапці, нагавіцы, спадніца, світка, чабоцікі, кажух, чапец, сукенка, гарсэт, сярмяжка, сарочка* і інш; назвы посуду і ёмістасцей: *чарка, шклянка, пляшка, кубак, тарэлка, скаварада, кілішак, гладыш, келіх, гаршчэчак, саганчык* і інш; назвы сельскагаспадарчых пабудоў і памяшканняў: *адрына, гумно, абора, хлеў, стадола, паветка* і інш.

Такім чынам, багаты лексічны фонд мовы твораў «беларускага дудара» дае магчымасць уявіць жыццё чалавека 18 стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1 Белая, А. І. Этнаграфізм як рыса эстэтычнай свядомасці пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя // Фальклор і сучасная культура / Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі 22–23 красавіка , 2008 г. – Мінск. – Ч. 1. / І. С. Роўда і інш. – Мінск : БДУ, 2008. – 198 с.

***А. У. Цітоў*** *(УА «МДУ ім. А. А. Куляшова»)*
*Навук. кір.* ***А. В. Шарапава****,*
*ст. выкладчык*

## УЗАЕМАСУВЯЗЬ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ І НАВУКОВА-КРЫТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АЛЕСЯ АДАМОВІЧА

Алесь Адамовіч уступіў у літаратуру параўнальна маладым па ўзросце, але за плячамі ў яго быў ужо значны жыццёвы досвед: вайна, лёс партызана ў пятнаццаць гадоў, нялёгкія выпрабаванні на фізічную і духоўную цягавітасць. Пазней убачанае ў партызанах знойдзе адлюстраванне як у мастацкіх творах, так і ў крытычным падыходзе да літаратуры. Такі пачатак творчага шляху – прыход у літаратуру праз літаратуразнаўчыя інтарэсы – стане тыповым для значнай часткі маладых крытыкаў. Праўда, непасрэдна ў А. Адамовіча не назіралася выразна выяўленых этапаў: спачатку літаратуразнаўства, а потым крытыка. Ён стаў адразу выступаць актыўна і як даследчык літаратурнай спадчыны, і як крытык. Валодаючы ўжо ўсесаюзным аўтарытэтам крытыка і літаратуразнаўцы, А. Адамовіч звярнуўся да жанру прозы – напісаў дылогію “Партызаны”. У ёй увасоблены новы прынцып малюнка народнага жыцця на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Творчая пазіцыя пісьменніка складалася пад уздзеяннем галоўнай тэндэнцыі ў развіцці ўсёй савецкай літаратуры таго часу – яе імкнення да праўдзівасці, нават дакументальнасці, да ўзмацнення гуманістычнага пафасу ў мастацкім малюнку падзей вайны. Пісьменнік паслядоўна сцвярджае думку, што жыццё не мае раз і назаўжды дадзенай вонкавай перадвызначанасці, што ў яго зменлівай складанасці неабходна разбірацца кожны раз нанова. Гэта вельмі ясна выявіла вайна. Новая глыбіня творчай пазіцыі запатрабавала ад літаратуры жанрава-структурных і стылявых змен. Знешне гэта выявілася ў тым, што дзеянне ў творы яшчэ больш звужаецца, засяроджваецца на лёсе некалькіх герояў. У «Партызанах» рэалізавалася тэндэнцыя да даставернай перадачы

асабіста перажытага, што мяжуе з дакументальнасцю. Яна будзе выразнай і ў працэсе далейшай творчай эвалюцыі пісьменніка. Дылогія стваралася ўжо з пэўнай часавай дыстанцыі. Яе змест уключаў і маральны досвед пасляваенных гадоў пісьменніка і крытыка. Ён шмат думаў пра праблемы бягучага жыцця і пра стаўленне да яго літаратуры. Падобнае не магло цалкам увасобіцца толькі ў творах пра гераічнае мінулае. У праблемным полі «Партызанаў» было нямала сюжэтных завязак, накіраваных у пасляваенны мірны час. Сам ход творчага развіцця пісьменніка вёў яго да сучасных тэм і праблем, якія пазней адлюстраваліся ў кнізе «Ничего важнее», дзе А. Адамовіч выступае не столькі як пісьменнік, колькі як даследчык псіхалогіі знішчэння. Даследаваць псіхалогію нацызму неабходна для таго, каб фашызм нашых дзён стаў вядомы і ясны, каб барацьба з ім была бескампраміснай.

***Т. В. Трубкіна** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская,***
*д.ф.н., прафесар*

## КАМПАНЕНТ БЕЛЫ І ЯГО СІМВОЛІКА Ў ФРАЗЕАЛАГІЗМАХ

Колер, з'яўляючыся міждысцыплінарным аб'ектам даследавання розных навук і сфер чалавечай дзейнасці, сустракаецца даволі часта ў фразеалагізмах. Кампанентамі фразеалагізмаў беларускай мовы выступаюць самыя розныя найменні колераў, з якіх выдзелім белы, які колькасна пераважае над іншымі і з'яўляецца адным з базавых у шматлікіх мовах і культурах.

Са старажытных часоў нашы продкі ўспрымалі белы колер як эквівалент дзённага святла, як нешта добрае, як прымету незямных сфер, бо ён звязаны з аблокамі, духоўнасцю, боскасцю. У фразеалагізмах *у белы свет* 'неведама куды' і *ў белы свет як у капейку* 'ў невядомым напрамку' *белы* атаясамліваецца з пэўным уяўленнем чысціні, свабоды выбару.

Фразеалагізм *рабіць з белага чорнае* 'падаваць што-н. у іншым выглядзе' трэба разглядаць як пераход з адной стыхіі ў другую. Паводле трактоўкі Арыстоцеля, белы адпавядае колеру трох стыхій: вады, паветра, зямлі, а чорны "соответствует стихиям при переходе одной в другую".

Аснову фразеалагізма *белая варона* 'чалавек рэзка непадобны да іншых людзей сваімі паводзінамі ці знешнім выглядам' складае біялагічны факт: прырода дапускае памылкі, якія сучасная навука трактуе як генетычная збоі ў кодзе, таму і сустракаюцца індывіды, афарбоўка якіх з'яўляецца рэдкасцю для віда.

Фразеалагізм *белая пляма* паходжаннем абавязаны аднаму факту: пры стварэнні геаграфічных карт, калі недаследаваная мясцовасць мела выгляд белай, пустой плямы. Вось чаму значэнне 'нявырашанае пытанне, нераспрацаваная праблема' – гэта абагуленае найменне на аснове канкрэтнага, а белы колер атаясамліваецца з пустатой, чысцінёй.

Фразеалагізм *да сівых валасоў* у значэнні 'да глыбокай старасці, да старэчага ўзросту' таксама ўваходзіць у склад фразеалагізмаў з найменнем белага колеру, які выражаны тут ускосна, бо сівыя валасы белыя. Белы колер звязаны з тым, што ў іканаграфіі адзенне апосталаў, ангелаў белага колеру, белы саван нябожчыка – гэта знак далучэння чалавека да боскага чына, таму сівізна – знак набліжэння смерці. У выніку белы колер тут атаясамліваецца са смерцю, з тым светам.

Такім чынам, белы колер у фразеалагізмах набывае самыя розныя значэнні і адценні, мае сваю сімволіку ў складзе фразеалагізмаў, а магчыма, наадварот, выяўляе свае адметнасці, абумоўленыя значэннем колеру ў мінулым нашага народа.